**А.А. Трусаў (Мінск)**

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ РАТУШ

Беларускія ратушы — цікавая група помнікаў грамадзянскай архітэктуры. Яны сведчаць пра тое, што акрамя прыватнаўласніцкага ў Беларусі, пачынаючы з XVI ст., вядзецца шырокае гарадское будаўніцтва, складваецца сапраўдная архітэктурная школа, якая ў канцы XVIII ст. сфарміравалася ў самастойны накірунак гарадскога дойлідства.

Ратуша ў перакладзе з нямецкай азначае «дом сходаў». Першыя такія дамы з'явіліся ў Заходняй Еўропе ў XII ст. і з часам набывалі ўсё больш мануметальныя формы.

Будынак ратушы, звычайна прамавугольнай формы, будаваўся ў цэнтры горада, пасярэдзіне плошчы, дзе адбываліся кірмашы. Ратушу амаль заўсёды ўпрыгожвала вежа, якая выконвала ролю назіральнай вышкі (у выпадку пажару альбо ваеннага нападу). Галоўным памяшканнем ратушы была зала пасяджэнняў магістрата на другім паверсе асноўнага будынка. Вакол ратушы мясціліся гандлёвыя рады і крамы.

XVI ст. у Беларусі характарызуецца росквітам гарадоў, імкненнем іх да самакіравання — атрымання так званага магдэбургскага права.

Магдэбургскае, ці майдэборгскае, як яго часцей называлі нашы продкі, права ўзнікла ў заходненямецкім горадзе Магдэбургу ў XIII ст. і ўяўляла звод правоў і прывілеяў жыхароў еўрапейскага феадальнага горада. Юрыдычныя нормы, замацаваныя ў магдэбургскім праве, спрыялі развіццю эканамічнай і грамадска-палітычнай дзейнасці грамадзян, вызначалі іх стан і маёмасныя правы. Потым яно распаўсюдзілася на розныя гарады Паўночнай Еўропы і Прыбалтыкі, паступова прыйшоўшы на тэрыторыю Польшчы і Вялікага княства Літоўскага.

Першым з сённяшніх беларускіх гарадоў магдэбургскае права атрымлівае старажытнае Бярэсце (1390 г.). За некалькі год да гэтай падзеі ў 1387 г. Ягайла адпаведным прывілеем надаў магдэбургскае права сталіцы ВКЛ — гораду Вільне.

У XVI — першай палове XVII ст. магдэбургскае права мелі ўсе вялікія, сярэднія і большая частка дробных беларускіх гарадоў. Магдэбургскае права забяспечвала гарадам развіццё рамяства і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гандлю, вызначала месца і стан гараджан у феадальным грамадстве, бараніла іх ад уціску шляхты і вяліка-княскай адміністрацыі, спрыяла саслоўнаму адзінству.

Горад, які атрымліваў магдэбургскае права, меў права ствараць уласны орган самакіравання — магістрат. У склад магістрата ўваходзілі заможныя гандляры і рамеснікі. Магістрат кіраваў усім жыццём у горадзе і размяшчаўся звычайна ў спецыяльным будынку — ратушы.

У канцы XVI ст. усе вялікія беларускія гарады мелі ратушы, у асноўным драўляныя. У час шматлікіх пажараў яны звычайна гарэлі, і таму там, дзе магістраты мелі значныя сродкі, узводзіліся мураваныя будынкі.

На жаль, большая частка з іх не захавалася, а некаторыя загінулі ўжо ў XX ст. падчас войнаў і з-за абыякавых адносін да нашай культурнай спадчыны. Пытанне пра аднаўленне і прыстасаванне ратушных будынкаў пад сучасныя патрэбы паўстала ў 70-я — 80-я гг. мінулага стагоддзя, калі былі створаны рэстаўрацыйныя арганізацыі ў Мінску і гістарычных гарадах Беларусі.

Спачатку звярнулі ўвагу на віцебскую ратушу, будынак якой добра захаваўся ў гістарычным цэнтры горада. Першая драўляная ратуша была збудавана ў Віцебску пасля надання яму магдэбургскага права ў 1597 г. На «Чарцяжы месца Віцебска» (1664 г.) ёсць першая графічная выява віцебскай ратушы. Гэта двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак, пакрыты чатырохсхільным дахам і завершаны васьміграннай назіральнай вежай з купалам і шпілем.

Падчас раскопак віцебскай ратушы археолагі знайшлі мураваныя сцены паўпадвала і першага паверха ратушы XVII ст., зробленых з цэглы-пальчаткі і невялікіх камянёў. Другі паверх будынка і яго завяршэнне, напэўна, былі драўлянымі. У 1775 г. віцебская ратуша была цалкам перабудавана. У XVIII ст. у яе інтэр'ерах знаходзіліся шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя распісной «галандскай» кафляй, якую знайшлі падчас раскопак [1].

У 1974 г. былі выкананы праектна-рэстаўрацыйныя работы па аднаўленні гэтага ўнікальнага помніка архітэктуры. Былі разабраныя пазнейшыя дабудовы, якія моцна перашкаджалі першапачатковаму выгляду будынка па стане на XVIII ст. Зараз у адноўленым будынку Віцебскай ратушы знаходзіцца абласны музей.

Адна з самых старажытных мураваных ратуш на Беларусі пабудавана ў канцы XVI ст. у Нясвіжы. Яна некалькі разоў перабудоўвалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і захавалася да нашых часоў без верхніх паверхаў вежы. Значныя памеры, кампазіцыя плана надаюць нясвіжскай ратушы манументальны выгляд. Яе абрысы нагадваюць рэнесансныя прапорцыі замкаў і кальвініcцкіх збораў. Гандлёвыя рады, што прымыкаюць да ратушы з трох бакоў, складаюць разам з асноўным будынкам архітэктурны ансамбль, які ўпрыгожвае гарадскую плошчу.

Вонкавы дэкор ратушы просты і строгі. Яго арганічна дапаўняюць фасады гандлёвых радоў, аздобленыя аркамі, лапаткамі і прамавугольнымі нішамі. У 1998 г. будынак Нясвіжскай ратушы цалкам адноўлены, у тым ліку і ратушная вежа. Зараз Нясвіж разглядаецца як выдатны інвестыцыйны аб'ект. Яго наведвае не меней як 50 тысяч турыстаў у год. Інтэр'еры ратушы і яе прыстасаванне пад музей распрацавала польска-беларускае прадпрыемства «Рэнаватум». Тут знаходзіцца гарадскі музей.

Першыя звесткі аб існаванні Мінскай ратушы адносяцца да 1499 г. і звязаны з указаннямі па пабудове будынка. Аднак месцазнаходжанне першай драўлянай мінскай ратушы пакуль невядома [2].

У самым канцы XVI ст. (у 1591 г.) пачынаецца будаўніцтва мураванай ратушы ў Мінску. Яна размяшчалася ў цэнтры былога Высокага рынку (цяпер плошча Свабоды). Гэтая мясціна з XVI ст. да 30-х гадоў нашага стагоддзя з'яўлялася галоўным гандлёвым, адміністрацыйным і культурным цэнтрам нашай сталіцы. Вандроўнікі, якія наведвалі Мінск у XVII ст., пісалі, што ратуша з'яўляецца адным з самых славутых будынкаў на плошчы. У канцы XVIII ст. мінскі архітэктар Ф. Крамер перабудоўвае ратушу і надае ёй рысы класіцызму.

Паводле праектных чарцяжоў, гэта быў прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак, пасярэдзіне якога ўзвышалася вежа са шпілем. Тарцы галаўнога фасада і порцік перад уваходам былі ўпрыгожаны калонамі іанічнага ордэра. Памяшканні ратушы ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. займалі гарадскі суд, магістрат і гаўптвахта. У 30-я гг. XIX ст. тут знаходзілася музычная школа, а з 1844 г. — і гарадскі тэатр. Але ў 60-я гг. XIX ст. будынак ратушы быў ушчэнт разбураны.

Ідэя аднавіць мінскую ратушу ўзнікла ў 70-я гг. мінулага стагоддзя.

Падчас раскопак 1978 і 1988 гг. археолагі Валянцін Собаль і Зянон Пазняк выявілі падмуркі ратушы і фрагменты цаглянай муроўкі сцен, а таксама падлогу ў двух памяшканнях першага паверха, за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глыбленых у мацярык на 0,5 — 0,6 м. Будынак ратушы быў зроблены з малафарматнай цэглы-пальчаткі памерам 25 — 27 х 12 — 13,5 х 5 — 6 см у тэхніцы мяшанай муроўкі з выкарыстаннем камянёў. Таксама знойдзены рэшткі калон ад галоўнага і заходняга порцікаў, пабудаваных у XVIII ст. У цэнтральнай частцы ратушы археолагі выявілі рэшткі кафельнай печы XVII ст. з паліванай кафлі зялёнага колеру, вонкавая пласціна якой аздоблена раслінным арнаментам. Былі ў ратушы печы і з паліхромнай кафлі [3]. Потым рэстаўратары распрацавалі праект поўнага аднаўлення гэтага цікавага помніка нашай архітэктуры. Работы выканала архітэктурна-праектная майстэрня ТАА «Трайпл» па замове АТ «Стары Менск». Навуковы кіраўнік праекта — вядомы беларускі рэстаўратар Мікалай Багласаў. Знешні выгляд будынка зроблены паводле захаваўшыхся выяў і чарцяжоў. На вежы размясцілі герб Мінска з ветранікам (флюгерам) і прыгожы гарадскі гадзіннік. На другім паверсе павінна размясціцца зала гарвыканкома для ўрачыстых сустрэч. Першы і падвальны паверхі былі адведзены аўтарамі праекта пад музейную экспазіцыю, у тым ліку вялікі макет гістарычнага цэнтра Мінска пачатку XIX ст.

Адбудова Ратушы адбылася за год, і зараз гэта прыгожы і велічны будынак у цэнтры нашай сталіцы.

Адна з самых велічных ратуш Беларусі — Магілёўская — была ўзведзена ў другой палове XVII ст. на Гандлёвай плошчы (зараз Савецкая плошча) [4]. Гэта мураваны двухпавярховы будынак з высокай васьміграннай вежай пасярод галоўнага фасада. Пасля пабудовы ратушы Гандлёвая плошча стала галоўным адміністрацыйным і грамадскім цэнтрам Магілёва.

Кіраваў будаўніцтвам майстар Феска. Ён збудаваў толькі прамавугольны ў плане (30 х 15 м) будынак. Для пабудовы ратушнай вежы магілёўцы запрасілі іншаземца Крузберга. Але вежа, узведзеная ім на вышыню 40 локцяў (каля 26 м), нечакана звалілася. Праз некалькі гадоў, разабраўшы рэшткі папярэдняй няўдалай канструкцыі Крузберга, складаную працу па ўзвядзенні вежы выканаў беларускі дойлід Ігнат са сваёй арцеллю.

Звонку ратуша была абтынкавана, мела два ганкі — нізкі і высокі (парадны). На высокі ганак вялі ўсходы з разнымі балясінамі. Ратушную вежу аздабляў балкон з металічнымі кратамі і, магчыма, вялікі гадзіннік.

Ратуша пад стромкім дахам, пакрытым плоскай чырвонай дахоўкай, велічна ўзвышалася сярод нізкіх драўляных і мурава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных крам, ад якіх яе аддзяляў драўляны плот з мураванай брамай, пакрытай гонтам. Яшчэ здалёк падарожнік, які ўваходзіў у горад праз Алейную браму, бачыў пазалочаныя ветранікі (флюгеры) на франтоне ратушы, на дахах ганкаў і на вежавым шпілі.

У 1773 г. будынак ратушы капітальна перабудавалі. Фасады аздобілі шырокімі гарызантальнымі паясамі, якія падзялілі паверхі, рустоўка на ніжнім і дэкаратыўныя ліштвы над вокнамі другога паверха зрабілі яе падобнай да грамадскіх будынкаў губернатара і віцэ-губернатара, якія былі пабудаваныя ў стылі класіцызму побач з ратушай на Гандлёвай плошчы ў канцы XVIII ст. Пяціпавярховая вежа стала галоўнай вертыкальнай дамінантай горада разам са званіцай Богаяўленскага сабора.

У такім выглядзе ратуша захавалася да апошняй вайны, у час якой моцна пацярпела, але асноўны корпус і вежа ацалелі. На жаль, у 1957 г. гэты каштоўны помнік, які можна было аднавіць, быў разбураны разам з рэстаўрацыйнымі рыштаваннямі.

Ідэя аднавіць ратушу ўзнікла ў канцы 70-х гг. XX ст. У верасні 1979 г. былі праведзены археалагічныя раскопкі на месцы ратушы. Архіўны і археалагічны матэрыял дазволіў рэстаўратарам стварыць праект адбудовы магілёўскай ратушы. У адноўленым будынку хацелі размясціць «палац шлюбаў».

У 1992 г. была здзейснена першая, але няўдалая спроба аднаўлення ратушы. Аднак будаўнічыя работы неўзабаве надоўга спыніліся. Працы аднавіліся толькі ў 2004 г. Быў зроблены новы праект аднаўлення будынка такім, якім ён быў у сярэдзіне XVIII ст. [5]. Будаўнічыя работы пачаліся летам 2007 г. і праз год — 3 ліпеня 2008 г. — адбылося ўрачыстае адкрыццё адноўленага помніка беларускага дойлідства. Тут размясціўся музей горада Магілёва.

У XVIII ст. мураваныя ратушы будуюцца ў Гродне, Чачэрску, Шклове. Невялікія па памерах ратушы ўзводзяцца ў Слоніме і Шарашове. Яны не маюць вежаў (акрамя Віцебскай і Шклоўскай), але таксама разам з гандлёвымі будынкамі ствараюць адзіны ансамбль. Найбольш цікавая з іх — Чачэрская ратуша, фасады якой зроблены ў псеўдагатычным стылі [6]. Пасля рэстаўрацыі ў будынку размешчаны раённы музей. Адноўлена і шклоўская ратуша. У ёй знаходзіцца мясцовая школа, але ёсць і музейныя памяшканні.

Такім чынам, беларускія ратушы паступова аднаўляюцца і музеефікуюцца, спрыяючы патрыятычнаму выхаванню нашай моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура і крыніцы*

1. Чарняўскі, І. М. Віцебская ратуша / І.М. Чарняўскі // Энцыклапедыя. Археалогія і нумізматыка Беларусі. — Мінск: БелСЭ, 1993. — С. 132.
2. Денисов, В. Н. Площадь Свободы в Минске / В. Н. Денисов. — Минск, 1985. — С. 27.
3. Соболь, В.Е., Позняк, З.С. Раскопки Верхнего города в Минске / В.Е. Соболь, З.С. Позняк // Археологические открытия 1978 года. — М., 1979. — С. 446; Собаль, В. Е. Мінская ратуша / В. Е. Собаль // Энцыклапедыя. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Мінск: БелСЭ, 1993. — С. 431.
4. Трусаў, А. Магілёўская ратуша / А. Трусаў // Старонкі гісторыі Магілёва. — Магілёў, 1998. — С. 194—198; Ён жа. Магілёўская ратуша // Спадчына. — 1998. — №5. — С. 68—80.
5. Агееў, А.Р., Трусаў, А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне / А.Р. Агееў, А.А.Трусаў. — Магілёў, 2008. — С. 133.
6. Беларусы. У 8 т. Т.2. Дойлідства / А.І. Лакотка; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, А.І. Лакотка. — Мн.: Тэхналогія, 1997. — С. 335 — 336

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ